**1-ы вядучы.** У ліпені 1941 г. у вёсцы Турная пачаў дзейнічаць падпольны антыфашысцкі камітэт, які канчаткова аформіўся ў жніўні. Старшынёй стаў Дз. Барысюк, яго намеснікам — Ц. Краўчук, першы старшыня калгаса імя Калініна, утворанага ў Турной у 1940 г.

**2-і вядучы.** Акупіраванаму Кобрыну гітлераўцы надавалі важнае значэнне як стратэгічнаму вузлу аўтамабільных дарог і чыгунак. У іх планы ўваходзіла таксама аднавіць суднаходства на Дняпроўска-Бугскім канале. Партызанскія атрады, якія ўзніклі ў хуткім часе ў навакольных лясах, сталі наносіць адчувальныя ўдары па варожых камунікацыях.

**Чытальнік:**

Не, не будзе мой край любімы
Пад фашысцкай пятою стагнаць.
Беларуса дастойнае імя
Я нікому не дам зганьбаваць.

**1-ы вядучы:** Беларускую зямлю справядліва называюць краем быліннай партызанскай славы і воінскай доблесці. *(Гучыць фанаграма песні на словы А. Русака "Ой, бярозы ды сосны…")*

**Чытальнік:**

Калі на нас прыйшлі з вайною,
На бой смяротны ідучы,
Мой край, не ведаў ты спакою
На міг ні ўдзень, ані ўначы.
На помсту клікала трывога,
Лясы разгневана гулі,
І ад старога да малога–
Ўсе абаронцамі былі.

Мне не забыцца дзён агністых,
Ні страт цяжкіх, ні горкіх ран,
Гучаць суладна і ўрачыста:
І Беларусь, і партызан!     ( П. Броўка)

**1-ы вядучы.** Пра баявую славу партызан, пра іх гераічныя подзвігі напісана шмат твораў беларускімі пісьменнікамі. Гэта творы М. Лынькова“Векапомныя дні”, А. Адамовіча“Партызаны”, І.Шамякіна “Глыбокая плынь”, І. Навуменка “Вецер у соснах”, “Сасна пры дарозе”, І. Чыгрынава “Плач перапёлкі” і іншыя. Увогуле трэба сказаць, што беларусы стварылі вялікую літаратуру пра мінулую вайну.

**2-і вядучы.** Супраць захопнікаў вяло барацьбу ўсё насельніцтва акупіраванай Беларусі. Мірныя жыхары, дапамагалі партызанам, падпольшчыкам, рэгулярным часцям Чырвонай Арміі.

**1-ы вядучы.** На акупіраванай тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі ўводзілі "новы парадак". Адносіны да беларусаў былі вызначаны ў плане "Ост", згодна з якім прадугледжвалася 75% рускіх, беларусаў. Людзей палілі, закопвалі жывымі ў зямлю, атручвалі газам. Пад выглядам барацьбы з партызанамі карнікі ператваралі ў пустэльныя зоны цэлыя раёны, дзесяткі вёсак змяталіся з твару зямлі, жыхары іх знішчаліся, вывозіліся ў канцлагеры ці ў фашысцкае рабства ў Германію.

**2-і вядучы:** У вёсцы Рэчыца 5 верасня 1942 г. карнікі спалілі 45 дявароў, расстралялі ці спалілі жывымі 64 яе жыхары. Такі ж лёс напаткаў і вёску Барысаўка, у якой 23 верасня 1942 г. фашысты расстралялі 169 чалавек, сярод якіх было 97 жанчын і 23 дзіцяці. 23 лютага 1943 г. фашысты расстралялі 24 жыхары вёскі Быкі, у вёсцы Арол яны спалілі 12 двароў, расстралялі 18 чалавек, у вёсцы Лука спалілі 75 двароў і расстралялі 20 чалавек. 13 ліпеня 1944 г. гітлераўскія каты знішчылі вёску Павіцце, дзе было спалена 127 двароў, расстраляны і спалены жывымі 141 яе жыхар. Усяго ў Кобрынскім раёне нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 1693 двары і знішчылі 3767 мірных жыхароў.

**Чытальнік:**
Суайчыннік, стань!
Тут знішчалі людзей!
Суайчыннік!
Запомні навек:
Тры гады па сто трыццаць сем у дзень,
І ў гадзіну- па шэсць чалавек.
Гэта значыць, што кожныя дзесяць хвілін
Тут навекі чарнеў небакрай.
Попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі:
Памятай... Памятай... Памятай...

**2-і вядучы.** За час акупацыі гітлераўцы правялі ў Беларусі больш як 140 карных экспедыцый, у час якіх цэлыя раёны ператварыліся ў "зоны пустыні".

**Чытальнік:**

*(Верш чытаецца на фоне мелодыі песні"Хатынь")*

Над спаленай вёскай,
Адзетай жалобным гранітам,
Званы абзываюцца
Рэхам вайны незабытым.
Хай вечны агонь,
Што запалены ў памяць Хатыні,
Як рунь і як неба
Палае– зялёны і сіні.

Няхай яго полымя
Жытам спякотным і спелым
Схіляецца ў ногі
Хатыні дварам камянелым.
Парогу халоднаму,
Прызбе маўклівай пры хаце.
Хай гора, заснуўшае ў камні,
Прачнецца ў набаце.

**1-ы вядучы.** Звоняць, звоняць, званы Хатыні, горам адгукаюцца ў душах людзей, якія перажылі жудасныя гады акупацыі, і тых, хто нарадзіўся пасля вайны. Хатынь– гэта сімвал вялікай трагедыі, той, што навекі захоўваецца ў людской памяці і ў сэрцах кожнага новага пакалення.

*Стук метранома. На сцэну выходзяць чытачы-падлеткі з запаленымі свечкамі.* ***Хвіліна маўчання.***

**2-і вядучы.** Дарогі вайны... Колькі іх пройдзена савецкімі воінамі па стэпах і балотах, камяністых пераважах і ўзгорках, лясных масівах і чыстых палях. Ад Брэста да Масквы 1000 кіламетраў, ад Масквы да Берліна - 1600 . Усяго 2600 кіламетраў.

**1-ы вядучы.** Гэта калі лічыць па прамой. Так мала, ці не праўда? 2600 кіламетраў. Цягнікам - чацвёра сутак, самалётам - 04:00, а перабежкамі па - пластунску - чатыры доўгіх гады.

**2-і вядучы.** Вайна ... Гэта бясстрашнасць абаронцаў Брэста, гэта 900 дзён блакаднага Ленінграда, гэта прысяга панфілаўцаў : "Ні кроку назад, за намі Масква!"

**1-ы вядучы.** Гэта здабытая агнём і крывёй перамога пад Сталінградам, гэта подзвіг герояў Курскай дугі, гэта штурм Берліна, гэта памяць сэрца ўсяго народа.

**2-і вядучы.** Забыцца на мінулае - значыць здрадзіць памяці пра людзей, якія загінулі за шчасце Радзімы, забыцца пра ўсіх, хто вынес гэтыя страшныя нягоды дзеля нас.

**1-ы вядучы.** Не, ні нам, ні нашым дзецям забываць пра гэта нельга. Мы будзем памятаць пра гэты подзвіг. Мы вечна будзем шанаваць памяць пра ўсіх, хто выстаяў у тыя гады, хто аддаў свае жыццё за Перамогу.

Калі за кожнага загінуўшага ў другой сусветнай вайне чалавека абвясціць хвіліну маўчання, свет маўчаў бы пяцьдзесят гадоў.

**Чытальнік:**

Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край, -
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,
Цвіў гэты белы-белы май, -
Часцей, мой друг успамінай!

*(Н. Гілевіч)*

**1-ы вядучы.** Жудасная памяць вайны, не сціхае гора, не затуманьваецца слава подзвігу народнага. Жыве сёння і ад пакалення ў пакаленне ідзе ў заўтра эстафета гэтай памяці. Сёння ў нашай зале прысутнічаюць людзі розных пакаленняў. Тут і людзі, чыё дзяцінства выпала на гады ваеннага ліхалецця, і маладыя, для каго вайна– ужо даўно гісторыя…

**Чытальнік:**
Цябе я ўжо гадамі пераўжыў,
Але ж узрост не вымярае сталасць.
Ты маладым упаў на рубяжы,
Дзе толькі абеліскі прарастаюць.
Паклон табе за тое, што данёс
Акопны спеў і смутак па Айчыне.
Яна адна і ў спёку, і ў мароз.
Журботная,
Стаяла прад вачыма.
Радзіме ты ніколі не хлусіў,
Не кляўся без патрэбы на паперы.
Сваю душу навекі прасвяціў
Яе любоўю, мужнасцю і верай.
Я ад цябе адчуў упершыню
Пра віцязя,
Што смерць не абыходзіць,
Сабе заваяваў ты вышыню,
Куды не ўсе жывыя паўзыходзяць.
*(Юрась Свірка)*

**Чытальнік:**
Адгулі, адгрымелі гарматы,
Хмары чорныя адплылі,
Прынясіце кветкі салдатам,
Што палеглі на нашай зямлі.
Пакланіцеся нізка-нізка
Тым, хто зведаў агонь і дым,
Чорным помнікам і абеліскам,
Слаўным зорачкам баявым.

Ля салдацкіх магіл памаўчыце.
Кожны з мужных салдат збярог
Цішыню і сонца ў блакіце
І сцяжынку на школьны парог.
Многа год пад сцягам крылатым
Крочыць мір па роднай зямлі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што свабоду для нас здабылі!

**Чытальнік:**
Я не глытала па акопах дыму
І франтавых не ведаю дарог.
Калі я нарадзілася, Радзіма,
Ты святкавала свята перамог.
І не выццё варожых самалётаў,
І не агонь, што пёк тваю зямлю, -
Чаромху помню, як цвіла ля плота,
Як падалі зярняты на раллю.
Цябе, вясняная, я помню ў цвеце,
Люблю з маленства, родная, люблю.
І за таго, каго няма на свеце,
Хто ўсё аддаў за гэтую зямлю.
Мае сябры ў жыцця да скону бралі
Усё, чым навучаем даражыць.
Мы за цябе яшчэ не паміралі,
Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць!

**2-і вядучы.** Як добра, што сёння мы можам вывучаць вайну, гартаючы старонкі кніжак. Як добра, што дзякуючы подзвігам нашых дзядоў і прадзедаў нам пашчасціла нарадзіцца ў мірны час. Ніщто– нічые пагрозы, ніякія навалы і войны– не прымусілі беларусаў забыць, якога мы роду-племені, не разарвалі повязі паміж пакаленнямі жывых і паўшых: наступаў час новых выпрабаванняў– і ўставалі сыны Беларусі на абарону дома свайго, веры сваёй, памяці сваёй.

**1-ы вядучы**. Так было спрадвеку. Так было ў саракавыя. Так будзе давеку! І сёння, у чарговы наш слаўны юбілей мы з пачуццём пашаны гаворым: "Нізкі паклон табе, слаўнае пакаленне пераможцаў! Вялікі дзякуй за тое, што мы жывем сёння ў мірнай прыгожай краіне!"

**Чытальнік:**

Свяціся кропкай весела і звонка,
Нясі ў прастор свой непамерны груз,
Жыць будзе Беларусь - мая старонка,
Сярод зямлян жыць будзе беларус!

*Гучыць мелодыя песні"Радзіма мая дарагая" (словы Алеся Бачылы, музыка Уладзіміра Алоўнікава).*

Дзякуй вам за ўсё, бацькі і дзяды!
Тым, хто ворага штыком і куляй браў!
І тым, хто, набліжаючы Дзень Перамогі,
Тыднямі цэха не пакідаў.
Дзякуй жанчынам, якія працавалі на нівах
Асірацелых вёсак.
Дзякуй!

*Гучыць песня "Люблю цябе, Белая Русь"(сл. У.Карызны, муз. Ю. Семянякі)*

# БЕЛАРУСЬ МАЯ, ТЫ СТАЛА ЗНОЎ ПРЫГОЖАЙ І СВАБОДНАЙ

***Патрыятычны час, прысвечаны вызваленню Беларусі***

Кожны год 3 ліпеня наша краіна адзначае важную падзею — свята вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З нашай памяці не сцерці тыя доўгія грозныя гады, якія да гэтага часу дзівяць сваімі небывалымі ахвярамі і стратамі, нябачаным масавым гераізмам, стойкасцю і еднасцю людзей.

Адзін у полі не воін,
Калі гэта поле чужое.
Устану ў полі адзін я,
Калі гэта поле — Радзіма.

Не дзеля красамоўства і аблуды,
Не для таго, каб часу дагадзіць,
І ў дзень высокі мой, і ў дзень мой судны
Я пра айчыну буду гаварыць.

Пра мой народ, што слаўным і дасціпным
Слыў паміж іншых і ў пашане быў
Меў сваё месца за сталом гасцінным,
Меў зброю вострую для барацьбы.

Дзе наша слава, гонар наш дзе?
За волю, за долю на бітву ідзе.

Шматпакутная наша Беларусь! Колькі табе давялося перанесці, колькі ворагаў прайшло па тваіх землях? Але ж ты, як сказаў паэт, вечна абдзёртая, вечна галодная, усё ж такі выстаяла, змагла перажыць усе цяжкасці ваеннага ліхалецця.

Ніколі не забудуць людзі тых, хто крывёю сваёю паліў тваю свяшчэнную зямлю. Мы не жылі ў той цяжкі час і не можам памятаць тых выпрабаванняў, якія выпалі на лёсы нашых дзядоў і прадзедаў. Але ёсць асаблівая памяць — памяць душы, памяць сэрца. Гэтую памяць мы пранясём праз гады.

*Гучыць фанаграма песні “Священная война”.*

Тут першы крок свой здзейсніла вайна
У чэрвені, у сорак першым, на світанні.
Колькі пакут нам прынясла яна
І колькі прынясла выпрабаванняў!

На лічбу 22 світанне
Перагарнула каляндар —
Дзень летняга сонцастаяння,
Дзень цішыні і летніх мар...

Дзень васількоў, травы мурожнай
І спелай чырвані суніц,
Дзень нашай памяці трывожнай
Здалёкім водбліскам зарніц...

Квітнеў наш край, а вораг з-за вугла
Зрабіў налёт, пайшоў на нас вайною.
І моладзь наша на вайну пайшла,
Бацькі, дзяды ўзялі ў рукі зброю.

І боль, і сум мне сэрца точыць.
Баюсь за бацьку і братоў.
Каса вайны ўсіх роўна косіць —
Ваякаў простых і байцоў.

Настаў вялікі час змагання,
Навечна кліча ўвесь народ.
Хай Богі споўняць нам жаданне,
Хай захаваюць беларускі род.

Суровым экзаменам на мужнасць і трываласць нашага народа стала Вялікая Айчынная вайна.

Мы цябе не хацелі, вайна,
Мы цябе не чакалі, вайна...

Але ціхі досвітак гэтага дня быў узарваны выбухамі артылерыйскіх снарадаў і авіяцыйных бомбаў. І першыя незагойныя раны атрымала менавіта беларуская зямля.

Залпы гармат на граніцы.
Пала на ўзмежак сасна.
Лязгат матораў.
І скрозь бліскавіцы —
Так пачалася вайна.

1113 жахлівых дзён і начэй працягвалася вайна на тэрыторыі Беларусі. Усе вогненныя дні і ночы наша краіна аказвала небывалае ў гісторыі чалавецтва супраціўленне агрэсару.

Увесь гэты час вораг не ведаў спакою ні ўдзень, ні ўначы. Зямля гарэла пад нагамі вылюдкаў-захопнікаў і іх хаўруснікаў, ляцелі ў паветра камунікацыі і склады, гарэлі на зямлі варожыя самалёты і танкі.

Кожны трэці беларус загінуў за тое, каб мы, іхнія ўнукі і праўнукі, маглі жыць на мірнай зямлі.

Стаяць у Беларусі помнікі, мемарыяльныя ансамблі і абеліскі. Велічныя і сціплыя. Тут пачыналася вайна, тут мужныя беларускія партызаны сотні дзён і начэй наносілі ўдары па акупантах, тут разгортваліся ўпартыя баі за вызваленне роднай зямлі. Удзячныя нашчадкі схіляюць галовы перад героямі

Вялікай Айчыннай вайны.

Увага! Ушануем хвілінай маўчання тых, хто загінуў, абараняючы нашу родную зямлю! (*Хвіліна маўчання.)*

Слава вам, мужныя і неўміручыя,
Памяць у сэрцах вечна жывая.
Вялікая справа была вам даручана,
Вечную славу народ вам спявае.

Шмат гадоў прайшло з Дня перамогі і ветэранаў засталося адзінкі. Не могуць яны забыць жудаснае ліхалецце, перабіраюць у памяці кожную хвіліну, гартаюць альбомы са старымі, выцвілымі ад часу фотаздымкамі.

Старэнькія, сівыя ветэраны,
Перад Вамі нізка я схіляю галаву
І пакланіцца да зямлі хачу Вам
За подзвіг Ваш, за тое, што жыву.

За дзень сягонняшні, за шчасце жыць у міры,
За сонца яркае і за блакіт нябёс,
За свет юнацтва дзякуем Вам шчыра
І за жыццё без гора і без слёз.

Незагойным балючым шрамам
Засталася на сэрцы вайна.
Крэпасць Брэсцкая — першая драма.
Шмат чаго нам гаворыць яна.

Неўміручы подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці вечны ў памяці народа. Пасля, у ходзе вайны, былі падзеі і больш значныя — абарона Магілёва, Масквы і Ленінграда, бітва на Курскай дузе... Было ўрэшце і вызваленне Беларусі. І штурм Берліна. Але Брэсцкая эпапея застанецца нязгасным агеньчыкам надзеі на перамогу.

Шлях да вызвалення роднай зямлі быў доўгі і нясцерпна балючы. Вызваленне Беларусі ад акупантаў пачалося 23 чэрвеня 1944 года. Вайна біла зямлю распаленым жалезам, агнём паліла гарады і сёлы, секла кулямі па лёсах людзей, і яны, нібы былінкі, падалі скошаныя, на родны дол. Кожны трэці... 2 мільёны 230 тысяч сыноў і дачок страціла Беларусь.

Вы бачылі лес, дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той,
дзе кожнай другой няма сасны
        ці сама меней — чацвёртай?
Тое *ж* было з народам маім.
        Сякера ваеннай навалы
прайшлася бязлітасна па ім,
        і — прагалы, прагалы.

Яны і сёння не зараслі.
Свіцяцца прасторай мёртвай...
Вы бачылі лес, дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той?
Зямля мая бой прымала, ад стара і да мала,
ад стогадовага Талаша да Казея-малыша.
І падаў, распасцёрты, кожны чацвёрты.
Мір асвятліў нас сваім святлом.
Грымелі ўрачыста акорды.
Толькі не быў за святочным сталом
кожны чацвёрты.
Доўга не трацілі ўдовы надзей,
доўга чакалі маці дзяцей.
Не верылі ўсё, што мёртвы кожны чацвёрты.
Помнім болі і страты свае, памяць шуміць, як чароты.
О, як нам вас не стае — кожны чацвёрты.
Кожны чацвёрты быў мёртвы-
мір і спакой ім вечны!
Кожны трэці быў змораны, скалечаны і знявечаны.
Кожны другі на целе меў раны, апёкі ці шрамы.
І ўсе мы, усе мы мелі на душы сваей раны.
Зеўралі ямы, траншэі, зеўралі ямы ў друзе –
ранай адной страшэннай на целе
маёй Беларусі.
Лічым: чацвёрты кожны. А можа, кожны трэці?
Голадам падкошаныя, паміралі дзеці.
Яшчэ мы не ўлічылі тых, хто лячылі раны,
раны не залячылі, рана паміралі.
Колькі прапала без вестак,
без пахавання, памінак!
А колькі потым дзетак узарвалася на мінах!
Лічым: кожны чацвёрты,
а той рахунак прыблізны,
а той рахунак няцвёрды,
а урон яшчэ больш вялізны.
*А. Вярцінскі*

Хіба можна было не ўзяцца за зброю?! Патрыятызм і чалавечая годнасць загадвалі ісці ў бой супраць тых, хто зацягваў краіну калючым дротам, хто прынёс у гэты працавіты, мірны край смерць, турмы і канцлагеры.

Вораг не меў літасці. У лагеры Трасцянец, пад Мінскам, тры гады знішчалі па 137 чалавек у дзень. Значыць, 6 чалавек у гадзіну. Значыць, кожныя дзесяць хвілін тут навекі паміралі зямля і неба, увесь Сусвет. За гады акупацыі фашысты знішчылі ў Трасцянцы 206 тысяч 500 чалавек.

Нікога не шкадавалі акупанты-душагубы. Увесь свет ведае сёння Хатынь — беларускую вёску на Лагойшчыне, дзе гітлераўцы жывымі спалілі ўсіх яе жыхароў — 149 чалавек, сярод іх — 76 дзяцей. Такі ж лёс у вёсак Кобрынскага раёна і яшчэ ў 186 вёсак Беларусі, якія зніклі ў агні і не існуюць болей.

Вораг меў моцныя абарончыя збудаванні: дзоты, доты, супрацьтанкавыя равы, мінныя палі. Шматлікія рэкі і балоты перашкаджалі руху тэхнікі. Захопнікі адчайна супраціўляліся. Беларусь была апошнім магутным рубяжом абароны фашыстаў на подступах да Германіі і яе сталіцы Берліна. Але час перамогі над ворагам імкліва набліжаўся. Стрымаць націск савецкіх войскаў гітлераўцы не змаглі. Магутная лавіна чатырох франтоў — трох Беларускіх і аднаго Прыбалтыйскага — навалілася на гітлераўцаў. Пад Мінскам у акружэнне трапіла 105 тысяч фашысцкіх салдат і афіцэраў. Так праходзіла вызваленне Беларусі.

Цяжка далася Перамога нашаму народу. Але вера ў свае сілы дапамагла выстаяць у нялёгкай барацьбе. Дапамагла выстаяць і вера ў непераможнасць нашай арміі, вера ў мужнасць, адвагу воіна-вызваліцеля.

Гэта ён, да пляча прытуліўшы прыклад,
Трапным стрэлам фашыстаў здымаў,
Гэта ён ваяваў за спакой нашых хат
І грудзямі навалу стрымаў...

Няма больш слоў, забіла дух,
Здаецца, сэрца *ўжо* не б’ецца,
У душы пачуўся новы рух
За вызваленне чалавецтва.

Перамога, Перамога, Перамога!
Чакалі ўсе цябе, чакалі быццам Бога.
Перамога, Перамога, Перамога!
Якая доўгая была твая дарога.

Яна ішла праз папялішчы, дым, пажары
І праз лясны гушчар, праз цемру чорнай ночы,
Прынесла гора нам, і слёзы, і ахвяры.
Вайны ніколі каб не бачылі нашы вочы!

Ішлі баі, грымелі, грукаталі пушкі,
У сінім небе не спявалі песні птушкі.
І ціха плакалі маўклівыя бярозы,
Дзіцячы плач пачуўшы, матчыныя слёзы.

Ахвяр — іх шмат, іх больш за два мільёны –
Вайна прынесла нам, прынёс фашыст шалёны.
На сэрцы лічбы, стогны, крыкі, цяжкі груз:
Загінуў кожны наш трэці беларус.

А з таго часу праляцелі 80 гадоў.
Шануем памяць нашых дзедаў і прадзедаў.
Няхай жыве ў кожным сэрцы Перамога
І светлай будзе яе памяць *і* дарога!

Дзень Перамогі, юбілей, якая дата!
Няхай жыве ў міры, згодзе кожна хата.
Ды не пакліча вас ніколі страх, трывога,
Няхай грыміць над мірам гучна: "Перамога!".

Мы, удзячныя нашчадкі, схіляемся перад доблеснымі франтавікамі і працаўнікамі тылу, якія сваім бессмяротным подзвігам у гады Вялікай Айчыннай вайны падарылі нам магчымасць мірна жыць і працаваць на свабоднай зямлі. Цаною многіх жыццяў беларусы заваявалі права на самастойнасць.

Не забывайце сцежкі даўнія,
    што мсціўцы вытапталі ў лесе,
Калі праз ночы легендарныя
    вам светлы дзень насустрач неслі.
І песень тых, што ціха пеліся
    перад паходам у зямлянцы,
Якімі сэрцы ў сцюжу грэліся...
    Не забывайце! Не забывайце!

Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што ўсё зрабілі –
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў ліпкіх смолках майскі луг,—
Не забывай пра іх, мой друг!
Часцей, часцей прыпамінай...

Я не ведаю войн, ды навошта мне гэта?
Я хачу мірна жыць, гімны пець прыгажосці.
Трэба мір берагчы, каб заўсёды былі
Толькі чуткі пра быўшыя войны.

Нам хораша ў нашай краіне.
Жыві, Беларусь, прыгажэй!
Пад небам праменістым, сінім
Хай Божа цябе беражэ!

Са Святам — Днём вызвалення Беларусі і Днём Перамогі!
Няхай ніхто і ніколі не зведае ваеннага ліхалецця. Светлага і мірнага нам усім неба!

# МЫ ПАМЯТАЕМ!

***Літаратурна – музычная кампазіцыя***

*На фоне музычнай кампазіцыі А. Вівальдзі 1 частка “Канцэрт для скрыпкі з аркестрам “Зіма” гучаць словы.*

**Чытальнік 1.**

Адплывае на захад гарматны гром,
Чорны снег і забітых белыя твары,
І пражэктар далёкі светлым багром
Б’е маўкліва ў чырвоную хмару пажару.
Мне б дабегчы і гэты пажар пагасіць,
Толькі рана баліць і замала сіл.
За плячыма — тысячы спаленых сёл
І дзясяткі разбураных гарадоў.
І я ведаю — гэта яшчэ не ўсё,
Гэта толькі пачатак трывожных гадоў.
Вы мне скажаце: будзе ізноўку бэз
І дзяўчаты у лёгкіх блакітных сукенках.
Для мяне ж яшчэ доўга расстрэлены лес
Захліпацца будзе дзіцячым енкам.
Ад чаромхі - чад і ад бэзу - дым,
Попел скрыпне ізноў на маіх зубах.
Нашей будучыні гады
Будуць доўга глытаць папялішчаў пах.
І цагляная чырвань новых муроў
На мяне пральецца, як кроў.
І за белаю вапнаю свежых сцен
Я ўбачу хаціны чорны шкілет.
З чарапоў густая трава парасце,
Лівень змые варожага танка след,
А за мною заўсёды, да самай труны,
Будзе крочыць праклятая здань вайны.
*Пімен Панчанка “Адплывае на захад гарматны гром...”*

**Вядучы 1.** У часу ёсць свая памяць — гісторыя.
І таму свет ніколі не забывае аб трагедыях, што сатрасалі чалавецтва ў розныя часы, у тым ліку і аб войнах, якія забралі мільёны жыццяў.
**Вядучы 2.** Прайшло амаль 79 гадоў, як скончылася Вялікая Айчынная вайна, але рэха яе да гэтага часу не сціхае ў душах людзей. Так, у часу свая памяць.
**Вядучы 1.** Мы не маем права забыць жахі той вайны, каб яны не паўтарыліся зноў. Мы не маем права забыць тых салдатаў, якія загінулі дзеля таго, каб мы зараз жылі. Мы абавязаны помніць...
**Чытальнік 2.**

Ты кажаш, я не ведаю вайны,

Што мне было тады гадоў замала.
Чаму ж яна мае забрала сны?
На ўсё жыццё наперад сны забрала?
Чаму ж амаль не кожнае начы
Я прачынаюся, скаваны жахам?
Хачу ад смерці лютай уцячы –
І стрымгалоў бягу аўсом няжатым,
Паўзу бульбянішчам па баразне,
Да хмызняку куляюся па пожні,
Але ратунку мне няма і ў сне –
У вочы стрэл грыміць у міг апошні...
Я ведаю: пазбыцца гэтых сноў
Не дапаможа мне ніхто на свеце.
Я буду трызніць імі зноў і зноў,
Яны — мае навек, да самай смерці.
Застаўшыся з маленства на вайне,
Я аднаго хачу, мая краіна:
Каб гэта скончылася ўсё на мне.
Каб гэта ўсё не стала доляй сына.
*Ніл Гілевіч "Ты кажаш, я не ведаю вайны"*

**Вядучы 1.** Мы павінны пакланіцца памяці тых, хто не вярнуўся з вайны, хто аддаў жыццё дзеля нас — нашчадкаў.
**Вядучы 2.** Давайце ж перагорнем некаторыя старонкі Вялікай Айчыннай вайны і ўспомнім, як гэта было...

**Чытальнік 1.**
"Крочыў" танк жалезнаю хадою
Па зямлі прывабнай і чужой.
Застагнала дрэўца маладое,
Як святар, забіты прад імшой.
Больш не стане ўжо духмяным хлебам
Залаты, як злітак, каласок.
Больш у вочы не ўсміхнецца небам
Знішчаны пачварай васілёк.
**Чытальнік 2.**
Пройдуць тракі па ўсяму, што свята,
Перамелюць радасныя сны.
"Крочыў" танк паходкаю вар'ята,
"Крочыў"танк паходкаю Вайны.
*Алесь Мацулевіч "Гукі вайны"*
**Вядучы 1.** На досвітку ў нядзелю 22 чэрвеня 1941 года мірную цішыню вёсак і гарадоў разарвалі выбухі бомб і снарадаў. Пачалася нябачная па сваіх памерах і жорсткасці вайна, якая ўвайшла ў нашу гісторыю як Вялікая Айчынная.

*Песня “Священная война”, музыка А. Аляксандрава.*

**Вядучы 2.** І паўстала велізарная краіна на смяротны бой, пасталелі да часу хлопчыкі і дзяўчынкі. Многія з-за парт пайшлі на фронт, здавалі экзамен на атэстат сталасці на лініі агню...

**Чытальнік 1.**

Ім не спявалі маткі калыханкі,
Яны не чулі казак ад дзядоў,
Палохаў іх ахрыплы голас танка,
Трывожыў іх журботны ёнк удоў.

Яны не плакалі бяссоннымі начамі,
Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.
І словы першыя, якім іх навучылі,
Былі пра немцаў, пра вайну і хлеб.

Заціхнуць бітвы. Вораг будзе знішчан.
І дзеці прычакаюць таго дня,
Калі з-пад воблака ўпадзе на папялішчы,
Як цёплы дождж, густая цішыня.

Нясмела з хат яны ў поле выйдуць,
Каб першы раз спакойна ў жыцці
Палюбавацца родным краявідам,
Паслухаць звон ручулкі ў трысці.

Пі пах лугоў, красой гаёў любуйся!
І ўсё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:
Ім здасца самалётам першы бусел,
Пажарам здасца першая зара.

Лагодны гром за дальняю дубровай
Напомніць ім пра жах бамбардзіровак.
І часта, часта ў чыстыя іх сны
Урывацца будуць галасы вайны.

*Пімен Панчанка “Дзеці вайны”*

**Вядучы 1.** Людзей, народжаных на пачатку 1920-х гадоў, называлі ветэранамі. А калі яны ўдзельнічалі ў баях у 1941-1945 гадах, многія з іх былі зусім юнымі і марылі, як і вы, аб каханні.

**Чытальнік 2.**

Жоўты месяц у пчаліных сотах,
І ляціць ад зор пчаліны звон.
Спіць на лузе пыльная пяхота,
Бомбы не ірвуць салдацкі сон.

Перш чым леглі, цэлы месяц беглі...

Адпачынак крохкі і малы.
Над ракой туман узняўся белы,
Маскіруе чорныя ствалы.

Камандзір чакае данясення,
Думая аб жонцы маладой:
“Эх, навошта паспяшыў з вяселлем...”
Смерць і рэўнасць ходзяць над вадой.

Ёсць вінтоўка і махоркі пачак.
Ёсць ватоўка, хлеб і зрэдку боршч.
Б’ешся чэсна ты, а людзі плачуць,
І на сэрцы ўсё цяжэй і горш.

Будзе ганьба. Будзе акупацыя.
Будзе потым пераможны май.
А пакуль што вокліч: “Акапацца!”
Уставай, салдат, і зноў капай.

Тэхніка пазней загрукатала.
А найбольш запомнілася нам,
Як сапла, варочала, крахтала,
Ціха мацюкалася вайна.

Ноч капалі моцныя акопы,
На світанні — зноўку адступаць...
Мы перакапалі паў-Еўропы,
Перш чым перамогу адкапаць.

Будуць вечна сады расцвітаць,
Белагрудыя ластаўкі лётаць
І дзявочыя ногі таптаць
Залатую лотаць.

Але гэткай вясны і снам
Не прыдумаць ніколі болей, -
Напаіла сягоння вясна
Успаміны болем.

Росы падаюць з ціхіх траў
На мае армейскія боты.
Растрывожыў, усхваляваў
Дрэў і кветак ласкавы дотык.

Думаў — толькі кроў і вайна,
Толькі жорсткія словы і думы.
Адгукнулася раптам яна,
Нібы рэха далёкае, сумам.

Вось, здаецца, поруч ішла б,
Гарадзіла б дзявочыя глупствы:
“Глянь — з бярозай цалуецца граб”
Ці “Дастань мне вясёлку на хусту”.

Не, не прыйдзе яна ў лясы:
Там, за фронтам, знаёмая хата...
І птушыныя галасы
Заглушае голас гарматы.

*Пімен Панчанка “У сорак першым”*

**Вядучы 2.** Вайна правярала на вернасць і самаадданасць, шчырасць і высакародства, мужнасць і адвагу...

**Чытальнік 1.**

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.

Ціха было і чыста
ў полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным тым.

Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой,
другое было ўзарата
вайной і паліта крывёй.

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі збіраў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

*Анатоль Вярцінскі “Два полі”*

## Частка 2. Беларусы на вайне

**Вядучы 1.** У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара, але нават залітая крывёй мільёнаў людзей, разрабаваная і напаўразбураная, краіна не здавалася. Праз многія дзесяцігоддзі памяць пра подзвіг народа, які ўнёс вялікі ўклад у Перамогу над фашызмам, — свяшчэнная.

**Вядучы** 2. Сярод 34,4 мільёна савецкіх воінаў, якія ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на франтах Вялікай Айчыннай вайны, больш за 1,3 мільёна — беларусы і ўраджэнцы Беларусі.

**Чытальнік 2.**

Лепей ніколі, нідзе
Абдымкаў такіх не бачыць,
Калі вырываюць дзіця
З матчыных рук гарачых;
Калі адрываюць яе
Ад цела забітага мужа, -
Лепей не бачыць нідзе
Гэткіх абдымкаў дужых.
Да хрусту ў суставах рук
Абдымкі байца-героя,
Што ранены, ледзь жывы
Сціскае рукамі зброю...
Абдымкі расстанняў, стрэч
З таварышам,
Другам,
Бацькам...
Абдымкаў век не разняць
У магіле брацкай.
*Генадзь Кляўко "Лепей абдымкаў такіх не бачыць"*

**Вядучы 1.** Акупіраваная фашыстамі Беларусь стала краінай, дзе разгарнуўся буйнейшы ў Еўропе партызанскі і падпольны рух. Супраць захопнікаў змагаліся больш за 374 тысячы партызан, больш як 70 тысяч удзельнікаў налічвала антыфашысцкае падполле.

**Вядучы 2**. Першы партызанскі бой Другой сусветнай вайны правёў 28 чэрвеня 1941 года ў наваколлі Пінска атрад легендарнага камандзіра Васіля Каржа.

**Вядучы 1.** Першымі партызанамі-героямі СССР у 1941 годзе сталі беларусы Ціхан Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі.

**Чытальнік 1.**

Калі над радзімай пажары шугалі
І неба гуло ад грымот,—
Пад шумнымі соснамі мы прысягалі
Табе, беларускі народ!
За край свой забраны
Ішлі ў партызаны,
Збіраліся дружна на бой!
А гора народа кружыла над намі,
І ў кожнага рана свая.
Палямі, гаямі, ляснымі шляхамі
Праходзіла наша сям'я.
За здзекі, за раны
Сыны-партызаны

Выходзілі ворага біць.
І ў цёмныя ночы, і ў раннія росы
Ад нашых адважных засад
Лятуць пад адкос мерцвякі-паравозы
І трупы фашысцкіх салдат.
Масты ўзлятаюць,
Машыны знікаюць
Пад смелым агнём партызан.
У нашых паходах сцягі баявыя,
І помста - адзіны наказ.
Мы бачым, як маці, ад гора сівыя,
Выходзяць насустрач да нас.
Не плачце, матулі,
Мы ўсіх вас атулім
Надзейнаю ласкай сваёй.
Хай многа наперадзе смутку і болю
Не раз нам яшчэ сустракаць,
Біць ворагаў лютых,
Клянёмся, ніколі
Не стоміцца наша рука,
Пакуль не заграе
Вясна залатая
Над роднаю нашай зямлёй.

*Пятрусь Броўка "Партызанскі марш"*

**Вядучы 1**. У час Вялікай Айчыннай вайны менавіта ў Мінску дзейнічала самае вялікае гарадское антыфашысцкае падполле ў Еўропе.
**Вядучы 2**. Беларусь, якая стаяла на шляху нацысцкай арміі Германіі, несла ў гады вайны незаменныя страты. На беларускай зямлі былі разрабаваны і разбураны 209 з 270 гарадоў. Фашысты правялі ў Беларусі больш за 140 парных аперацый, цалкам або часткова знішчыўшы 5454 вёскі.
*Гучыць мелодыя "Хатынскія званы".*
**Вядучы 1.** На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі больш як 260 лагераў смерці і месцаў масавага знішчэння людзей. У гэтым трагічным спісе...
**Вядучы 2.** ...Чацвёрты па велічыні ў Еўропе лагер смерці "Трасцянец", дзе знішчылі больш за 200 тысяч чалавек (ёсць сведчанні, што ахвяр было намнога больш - амаль 546 тысяч).

Жудасны дзіцячы канцлагер у вёсцы Чырвоны Бераг, дзе самымі бесчалавечнымі спосабамі з юных ахвяр - да смерці - забіралі кроў для патрэб нямецкіх шпіталяў.

Азарыцкая зона смерці, дзе пад адкрытым небам нацысты трымалі тысячы хворых на сыпны тыф, збіраючыся выкарыстоўваць людзей у якасці бактэрыялагічнай зброі супраць наступаючай Чырвонай Арміі...
**Вядучы 1**. Паводле няпоўных даных, у лагерах на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі амаль 1,5 мільёна чалавек — не толькі мясцовых жыхароў,

але і вывезеных з Аўстрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Францыі, Германіі...
**Вядучы 2.** Уначы на 1 мая 1945 года Чырвоны Сцяг Перамогі ўзняўся над Рэйхстагам.
**Вядучы 1.** Тое, што так доўга чакалі, да чаго імкнуліся доўгія гады вайны, здзейснілася!
**Чытальнік 2.**

Маўчаць кулямёты,
І міны не выюць.
Гарматы сваё адгулі.
Хлапцы баявыя,
Сябры франтавыя,
Мы ўсе з перамогай прыйшлі.

З баямі цяжкімі
Прайсці да Берліна,
Радзіма, паслала ты нас.
Па роднай краіне,
Па любай дзяўчыне
Мы ўсе сумавалі не раз.

Паднімем жа чаркі
Сям'ёю адзінай
За матак, сясцёр і братоў,
За нашу хаціну,
За сэрца-дзяўчыну,
З якімі мы стрэліся зноў.

Дык вып'ем, каб моладасць
Зноўку гуляла,
Каб праўда на свеце жыла,
Каб сонца іграла,
Каханка спявала,
Каб наша радзіма цвіла!

Маўчаць кулямёты,
І міны не выюць.
Гарматы сваё адгулі.
Хлапцы баявыя,
Сябры франтавыя,
Мы ўсе з перамогай прыйшлі.
*Пятрусь Броўка "Маўчаць кулямёты..."*

**Вядучы 2.** Так, мы перамаглі. Мы зацвердзілі мір на Зямлі... Але ж якім коштам! Колькі герояў не дажыло да светлага дня Перамогі!

**Чытальнік 1.**

У кожны міг, у кожны час

Душою, сэрцам я між вас,
Браты мае, байцы-сябры,
Зямлі святой багатыры!
Вялік прастор, шырок прасцяг —
На сотні міль пралёг ваш шлях.
На тым шляху і ўдоўж, і ўшыр
Бурліць смяротны бой, як вір.
Тэўтон-бандыт, фашыст-удаў
Бандытаў полчышчы нагнаў.
Ды пад навалай чорнай цьмы
Галоў сваіх не хілім мы.
І ўсё, што ў нас святога ёсць —
Радзіма, воля, слава, чэсць,—
Мы пранясём праз гром, агонь,
Варожых сіл раскрышым бронь.
Другіх дарог нам больш няма,
Сыноў жа цьмы агорне цьма.
Байцы-сыны, сябры, браты!
Мы выпаўнім наш доўг святы
І над раскутаю зямлёй
Узыдзем яснаю зарой.
Няхай вам свецяць сонца, дзень, А ворагаў агорне цень!
*Якуб Колас "Абаронцам роднай зямлі"*

**Вядучы 1.** Яны не забытыя, яны заўжды ў нашых сэрцах - людзі аднаго гераічнага лёсу.
**Вядучы 2.** Яны загінулі, але яны жывуць у нашай памяці. І іх думкі і пачуцці павінны набыць голас.

**Чытальнік 2.**
Часцей, часцей прыпамінай...
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край, -
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,
Цвіў гэты белы-белы май, -
Часцей, мой друг, прыпамінай!
Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што ўсё зрабілі –
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў ліпкіх смолках майскі луг, -
Не забывай пра іх, мой друг!..
*Ніл Гілевіч "Часцей, часцей прыпамінай..."*

## ЗА ТО, ЧТОБ МАЛЬЧИКИ ВОЙНУ
## УЗНАЛИ ТОЛЬКО НА БУМАГЕ

### *Сценарий урока памяти, посвящённого освобождению Беларуси от немецко-фашистских захватчиков*

**Диктор.** Внимание! Внимание! Передаем сообщение информбюро. Нашими войсками победоносно завершена операция по освобождению Беларуси от немецко-фашистских захватчиков.
*(песня «День Победы»)*

**Ведущий 1.** Слушай нас, товарищ Время! Слушай История и Современность! Мы – наследники героического прошлого, в чьих сердцах живет память о бессмертном подвиге отцов и дедов.

**Ведущий 2.** Мы – настоящее. Мы – будущее. Вы отстояли мир! Мы сохраним его! *(Звучит Гимн Республики Беларусь).*

Трубите фанфары! Греми барабан!
По сёлам и городам.
Пусть флаги алеют.
И горны поют Ветеранам Отечественной
И белизна снегов, и зелень трав…
Для нас всѐ это сберегли солдаты,
Врага разбив и смертью смерть поправ.
Никогда не забыть, поверьте,
Как во имя светлой зари
Шли на смерть, а вошли в бессмертье
Наши чудо богатыри!
Отгремели залпы салютов,
И окопы травой поросли,
Только вам не забыть и минуты
Той большой многодневной войны.
И мозоли болят, как раны,
И тревожны рассветные сны.
Низкий вам поклон, ветераны,
Заслонившие нас от войны.
*(Звучит песня «Священная война»)*

**Ведущий 1.** Война… Суровое слово с быстротой молнии пронеслось по городам и сёлам нашей Родины.

**Ведущий 2.** Беларусь одной из первых приняла на себя удар агрессора. Более месяца героически сражались защитники Брестской крепости.

**Ведущий 1.** Кратковременные бои шли в районе Бреста, Гродно, Кобрина, Барановичей, Лиды. Тяжёлые были первые дни и недели Великой Отечественной войны.

**Ведущий 2.** Острой болью в сердцах каждого отдавались наши неудачи, временное отступление, страдания людей.

**Ведущий 1.** Но и в эти тяжёлые дни советские люди верили, что враг будет разбит, победа будет за нами. Оккупировав летом 1941 года территорию нашей республики, фашистские захватчики установили на белорусской земле, так называемый новый порядок – режим террора и рабства. Они лишили Беларусь государственной самостоятельности, восстановили буржуазно-помещичьи порядки, лишили белорусский народ гражданских прав и свобод. Везде, где ступала нога фашистского солдата, совершались неслыханные по своей жестокости преступления, жертвами которых были мирные люди, старики, женщины, дети. 186 белорусских деревень были сожжены вместе с жителями.

**Ведущий 2.** 22 марта 1943 года трагическая дата для 149 жителей Хатыни, которых сожгли фашисты, среди них было 76 детей. Юзику Иотко было 4 года, Мише Желобковичу – 2 года, а Толику Яскевичу всего 7 недель. Они так и не успели понять, зачем сгоняют всех в темный сарай, зачем заколачивают широкие ворота.

**Ведущий 1.** 260 лагерей смерти создали на территории оккупированной Беларуси фашистские варвары. Среди них лагерь смерти Малый Тростенец, что в 10 км от Минска по Могилёвскому шоссе. Здесь было уничтожено свыше 206 000 мирных граждан. Лагерь для советских военнопленных в километре от города Полоцка. Режим лагеря был направлен на массовое истребление заключённых. Их морили голодом, заставляли выполнять непосильные работы, а тех, кто выбивался из сил, расстреливали на месте. Полуживых военнопленных вывозили на берег реки Полота, расстреливали и сжигали. За три года оккупации на территории Беларуси фашисты расстреляли, повесили, замучили и сожгли свыше 2 млн. 200 тыс. советских граждан. Погиб каждый четвёртый. Фашисты превратили в руины 209 городов Беларуси, уничтожили 9200 сел и деревень.

**Ведущий 2.** Советский народ не хотел мириться с участью рабов. На оккупированной территории активно развернулось партизанское движение, подпольная деятельность, саботаж населением всех мероприятий оккупантов. По своему размах борьба в тылу врага не имела равной себе в истории, и героем в ней был каждый: и боец партизанского отряда, и деревенский парнишка, ставший связным, и седовласый старик, указывающий партизанам

тропы через непроходимые болота, и женщина, ухаживающая за ранеными. Только на территории Беларуси боролось свыше 440 000 партизан и подпольщиков. Неслучайно с любовью и уважением называли тогда Белоруссию «партизанской республикой».

**Ведущий 1.** 23 июня 1944 года началась операция по освобождению Белоруссии. План операции, получивший условное название «Багратион», предусматривал решение крупных военнополитических задач: разгром группы армии «Центр», освобождение Белоруссии, восстановление западной государственной границы СССР, оказание помощи Польше. Для нанесения удара были сосредоточены силы и средства 4-х фронтов: 1-го Прибалтийского и 3-х Белорусских. Это свыше 24 миллионов человек, более 36 тысяч орудий и минометов, более 5000 танков, 5300 самолетов.

**Ведущий 1.** Большую помощь Красной Армии оказали белорусские партизаны. Только за одну ночь они подорвали свыше 40 000 рельсов. Железнодорожное движение было парализовано. Партизаны захватили и удерживали до подхода советских войск десятки железнодорожных станций. 3 июля 1944 года была освобождена столица республики – город Минск, а 28 июля советские войска вышли на государственную границу, освободив всю Беларусь.

**Ведущий 2.** Война… От Бреста до Москвы тысяча километров, от Москвы до Берлина – 1600. Итого 2600 километров.

**Ведущий 1.** Это если считать по прямой…

**Ведущий 2.** Не так и много, правда? 2600 километров. Если поездом, то менее четырёх суток, а самолетом примерно 4 часа.

**Ведущий 1.** Перебежками и по-пластунски 4 года. 1418 дней, 34 000 часов. И более 20 миллионов погибших советских людей.

**Ведущий 2.** 20 миллионов на 2600 километров. Это значит семь с половиной тысяч убитых на километр, пятнадцать человек на каждые два метра земли.

**Ведущий 1.** А сколько было раненых! Сколько молодых парней остались инвалидами на всю жизнь? А сколько вдов сирот? Разве цифрами можно измерить человеческое горе? Разве цифрами можно определить героизм советских людей, прошедших за 1418 дней эти самые 2600 километров, чтобы на ступенях поверженного рейхстага наконец-то устало присесть, отложив автомат, и сказать с облегчением: «Все, ребята, конец».
*(Звучит песня «Безымянная высота»).*

**Ведущий 2.** Давным-давно закончилась война, но как бы мы того не захотели, всей боли, что оставила она, нам не забыть. И цвет её шинели нам тоже, как цвет крови, не забыть.
*(Всем присутствующим гостям дарят подарки, цветы)*

**Диктор.**
Скупая слеза тишину сторожит.
Бьётся огонь.
Золотое сиянье Скорбно ложится на серый гранит.
Тихо постой у огня, помолчи.
*(Минута молчания. Стук метронома)*

**Ведущий 1.** Мы живём в мирной, свободной стране. Учимся, трудимся, растим детей. У каждого народа свои мечты, свои надежды. Но всех объединяет одно желание, одна мечта – сохранение мира на земле.

**Ведущий 2.** Рисуют мальчики войну…
Благодари свою страну
И тех, кто пал в последнем шаге
За то, чтоб мальчики войну
Узнали только на бумаге.

Дорогие друзья! Мы поздравляем вас с Днем победы! Мероприятие, посвящённое освобождению Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, объявляется закрытым.

Інфармацыйна – метадычны зборнік да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

“Беларусь: шлях подзвігу і Перамогі”

Складальнік

Галавейка Т. А.

Рэдактар

Легацюк Л. В.

Камп’ютарная вёрстка Т. А. Галавейка

Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме

Кобрынскай цэнтральнай раѐннай бібліятэкі

вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын

Цэнтральная раённая бібліятэка

E-mail kobrinlib@gmail.com

www.krcls.by